## ДЭРЫВАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ДЗЕЯСЛОВАЎ *БАЯЦЦА* І *SCARE*

*В.А.Серада (Мінск, МДЛУ)*

У артыкуле прадстаўлены кампаратыўны аналіз структуры і прадуктыўнасці словаўтваральных гнёздаў з эматыўнымі дзеясловамі баяцца і scare у якасці вяршыняў.

**Ключевые слова:** *словообразовательное гнездо; словообразовательная парадигма; словообразовательная цепочка; производное слово.*

## WORD-FORMATION POTENTIAL OF THE VERBS БАЯЦЦА І SCARE

*V.A.Sereda (Minsk, MSLU)*

The article presents comparative analysis of the structure and productiveness of the families of words with emotional verbs *баяцца* and *scare* as the peaks in the Belarusian and English languages.

**Key words:** *family of words; word-formative paradigm; derivative*

Даследаванне прысвечана супастаўляльнаму аналізу словаўтваральных гнёздаў (далей – СГ) з эматыўнымі дзеясловамі *баяцца* і *scare* у якасці вяршынь. Мэтай з’яўляецца выяўленне рыс падабенства і адрознення ў саставе і прадуктыўнасці СГ гэтых дзеясловаў.

У сучаснай лінгвістыцы праблематыка даследавання СГ значна пашырылася і ўскладнілася. Вывучэнне СГ накіравана на выяўленне заканамернасцей, звязаных з дзеяннем яго ўнутранага механізму, на вызначэнне фактараў, якія ўплываюць на ступень словаўтваральнай актыўнасці слоў, на пабудову тыпалогіі гнёздаў. Апісанне фармальнай і семантычнай структуры СГ з пазіцый ступені і характару іх эквівалентнасці ў розных мовах мае вялікае значэнне для тэорыі і метадалогіі супастаўляльнага мовазнаўства. Вынікі такога даследавання могуць стацца каштоўнымі для развіцця канцэпцыі ўніверсальных спосабаў семантызацыі ў мове.

СГ з вяршыняй *баяцца* ўяўляе сабой складанае структурнае ўтварэнне з 11 вытворных. Словы, звязаныя паміж сабой адносінамі паслядоўнай вытворнасці, утвараюць 7 словаўтваральных ланцужкоў. СГ налічвае ўсяго 2 парадыгмы слоў *баяцца* і *баязлівы* па 4 адзінкі.

На першай ступені вытворнасці СГ *баяцца* размяшчаюцца 3 дзеясловы, утвораныя прэфіксацыяй і 1 назоўнік, утвораны пры дамамозе нульсуфіксацыі. На другой ступені 1 дзеяслоў і 1 прыметнік, утвораныя пры дапамозе суфікса. Вытворныя 3 ступені ўяўляюць 2 назоўнікі і 1 прыслоўе, утвораныя пры дапамозе суфіксаў; 1 прыметнік, утвораны пры дапамозе прэфікса.

На чацвёртай ступені вытворнасці размяшчаецца толькі 1 назоўнік, утвораны суфіксальным спосабам.

Табліца 1.— СГ дзеяслова *баяцца*

| Вяршыня | 1 ступень | 2 ступень | 3 ступень | 4 ступень |
|---|---|---|---|---|
| Баяцца **V** | Бо**язь N** | Баяз**лів**ы **Adj** | Баязлів**а Adv** | |
| | | | Баязлів**асць N** | |
| | | | Баязлів**ец N** | Баязліў**ка N** |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | **Не**баязлівы **Adj** | |
| | **За**баяцца **V** | | | |
| | Збаяцца **V** | | | |
| | **Па**баяцца **V** | Пабой**ва**цца **V** | | |

СГ дзеяслова *scare* уяўляе сабой складанае структурнае ўтварэнне і ўключае 23 адзінкі. СГ утвараюць 17 словаўтваральных ланцужкоў, 8 з якіх складаюцца з трох звёнаў, 1– з чатырох звёнаў, 1 — з шасці звёнаў і яшчэ 7 бінарных словаўтваральных ланцужкоў. СГ мае 4 словаўтваральныя парадыгмы, найбольшая з якіх утвараецца дзеясловам *scare* і налічвае 12 адзінак; іншыя налічваюць па тры адзінкі (*scared, scare*(n)), дзве адзінкі (*scary*).

На першай ступені размяшчаецца 7 назоўнікаў, 4 прыметнікі утвораныя суфіксальным, складанасуфіксальным спосабам і пры дапамозе канверсіі; і 1 прыслоўе, утворанае складанасуфіксальным спосабам. На 2 ступені пры дапамозе складання і суфіксацыі ўтворана 4 назонікі, пры дапамозе прэфіксацыі і суфіксацыі 3 прыметнікі. Усе дэрываты на 3-5 ступенях утвораны суфиксацыяй.

Табліца 2. — СГ дзеяслова *scare*

| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|---|
| scare **V** | Scar**ed Adj** | | | | |
| | | scared**y-cat N** | | | |
| | | **Un**scared **Adj** | | | |
| | | **A**scared **Adj** | | | |
| | scar**ing Adj** | | | | |
| | Scar**ing N** | | | | |
| | Scare**monger N** | Scaremonger**ing N** | | | |
| | scare **N** | Scar**y Adj** | Scari**ly Adv** | | |
| | | | scari**fy V** | Scarify**ing Adj** | Scarifying**ly Adv** |
| | | | | | |
| | | scare-**buying N** | | | |
| | | scare-**line N** | | | |
| | scare **Adj** | | | | |
| | Scare**head N** | | | | |
| | Scare**crow N** | | | | |
| | Scarer **N** | | | | |
| | **harum**-scar**um Adj, Adv, N** | | | | |

Такім чынам, выяўлены наступныя падабенствы і адрозненні:

1. Абодва гнязды шырокаразгорнутыя. Асноўная частка дэрыватаў слова *scare* размяшчаецца на першай ступені словаўтварэння, у СГ *баяцца* першая і трэцяя ступені аднолькава прадуктыўныя.

2. Большасць вытворных слоў ў СГ *scare* з'яўляюцца назоўнікамі і прыметнікамі, тым часам як ў беларускім СГ вытворныя словы ў асноўным прадстаўляюць дзеясловы і назоўнікі.

3. У беларускім гняздзе аднолькава прадуктыўнымі з'яўляюцца суфіксальны і прэфіксальны спосабы словаўтварэння, у англійскім гняздзе — суфіксацыя і складанне.

Нягледзячы на тое, што дадзеныя дзеясловы з'яўляюцца аналагамі, слова *scare* мае цікавую семантычную асаблівасць — гэты дзеяслоў адначасова пераходны і зваротны і фактычна нясе ў сабе ўнутраную антанімію. Такая з'ява абумоўлівае, па-першае, большую колькасць вытворных слоў, а па-другое, розны семантычны склад гнязда; СГ дзеяслова *scare* уключае ў сябе адзінкі, якія ў беларускай мове перадаюцца пры дапамозе іншых каранёў.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Бадзевіч, З.І. Сучасная беларуская мова. Марфеміка. Марфаналогія. Словаўтварэнне: вучэб.-метад. дапам. / З. І. Бадзевіч, В. П. Русак. – Мінск: БДУ, 2017 – 227 с.
2. Бортничук, Е.Н., Василенко, И.В., Пастушенко, Л.П. Словообразование в современном английском языке: Учебное пособие. – [б.м.] Вища шк., 1988 – 261 с.
3. Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы /Аўласевіч М.А., Якубовіч Т.І. – Ч.І. – Магілеў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2002 – 242 с.
4. OxfordEnglishDictionary [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.oed.com/ – Дата доступу: 10.01.2025.
5. CollinsDictionary [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.collinsdictionary.com/ – Дата доступу: 10.01.2025.